# З-пад белага камушка




2. Там дзяўчына бель бяліла,
Туга выжымала,
Вой-ля, вой-ля, вой лялюшкі,
Туга выжымала.

3. Туга, туга выжымала
Да мілога ждала,
Вой-ля, вой-ля, вой лялюшкі,
Ды мілога ждала.

4. Едзе, едзе мой міленькі
Ды на сівым коню,
Вой-ля, вой-ля, вой лялюшкі,
Ды на сівым коню.

5. На ім шапачка з ражкамі,
Галоўка з кудрамі,
Вой-ля, вой-ля, вой лялюшкі,
Галоўка з кудрамі.